# Што такое “гардук”?

У сучасным беларуска-рускім слоўніку вы не адшукаеце адказ на гэтае пытанне. А вось з расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка В.Ластоўскага 1924 года выдання можна даведацца, што “гардук” – гэта “тюльпан”. Больш таго, маеце шанец знайсці ў ім шмат цікавых і, магчыма, невядомых слоў. Аднак такога слоўніка ў вас няма.

Знаходзіцца ён у Музеі гісторыі адукацыі ў Віцебску. Зараз гэты экспанат і яшчэ 25 падручнікаў пачатку XX стагоддзя можна пабачыць на выставе, якая дэманструецца ў мемарыяльным музеі Героя Савецкага Саюза М.П.Шмырова ў СШ №43 г. Віцебска. Яе ініцыятарамі сталі прафсаюзны камітэт і адміністрацыя школы. Як расказала старшыня прафкама Галіна Казлова, “захацелася ўнесці ў пачатак навучальнага года нейкую навізну, зрабіць нешта цікавае і пазнавальнае для ўсіх: і дзяцей, і дарослых. Мы звярнуліся да дырэктара Музея гісторыі адукацыі Тамары Марчык. Яна і прапанавала такую незвычайную выставу”.

- Для ўсяго калектыву – і педагогаў, і вучняў – атрымаўся прыемны сюрпрыз, - уступае ў размову захавальнік музея Ігар Гутнікаў. – І цяпер школьнікі прыходзяць у музей… рашаць задачы з арыфметычнага зборніка 1918 года. А там жа яшчэ такія меры, як аршын, фунт, локаць. Знаёмяцца з сусветнай гісторыяй Ф.Шлоссера, сярэдняй гісторыяй А.Трачэўскага, параўноўваюць з тым матэрыялам, які вывучаецца ў школе сёння. А настаўнікі знаходзяць шмат цікавай інфармацыі пра сваіх старадаўніх калег.

Аднак найбольш папулярнае выданне – “Домоводство” яшчэ 1900 года, дзе прадстаўлены не толькі самыя розныя рэцэпты страў, але і схемы правільнай сервіроўкі стала, планы тагачасных кватэр, посуд і кухонныя прыналежнасці пачатку стагоддзя, адлюстраваныя на малюнках. А ў раздзеле выданя “Подарокъ молодымъ хозяйкамъ, или средство къ уменьшению расходовъ въ домашнемъ хозяйстве” можна знайсці вельмі карысныя парады. “Педагогическій листок” 1899 года накіраваны на самаадукацыю выхавацеляў і настаўнікаў пачатковай школы. Унікальную дзіцячую кніжку невядомага аўтара без вокладкі яшчэ з “яцямі” і “ёрамі” пачатковай школы прынесла ў музей настаўніца, якой рарытэт дастаўся яшчэ ад прабабулі. А вось “Педагогическій листок” захавала вахцёр аднаго з віцебскіх універсітэтаў, калі спісвалі кнігі. Яе ўнук і падарыў кнігу музею. Такім чынам, сёння тут захоўваецца больш за 75 тыс. выданняў, прысвечаных школьнаму навучанню. Толькі слоўнікаў – 102 экзэмпляры. У наступным годзе, як гаворыцца, з лёгкай рукі прафкама 43-й школы плануецца зрабіць больш багатую экспазіцыю падручнікаў сярэдзіны XX стагоддзя. У перспектыве – паказаць у навучальных установах дакументы аб адукацыі як дарэвалюцыйных, так і даваенных часоў.

…А напаследак на аркушы са школьнага сшытка я пакінула свой “аўтограф”. Ды не сучасным “шарыкам”, а макнуўшы пяро ў чарніліцу, якой ужо больш за 100 гадоў.

**Любоў Трапезнікава.**

**Беларускі час, №42(1433) 25 октября 2013**